View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Repository of Belarusian National Technical University...

9. Жилин П.А. Отечественная война 1812 г. / А.П. Жилин. – М.: Наука, 1988. – 492 с.

10. Отечественная война 1812 года. От Малоярославца до Березины. – СПБ: Типография В.С. Балашова, 1877. – 269 с.

## “Беларускі скарб” Напалеона: міф ці рэальнасць?

**А.В. Лепеш, канд. гіст. навук, дацэнт**

У 2012 г. святкуецца 200-годдзе з нагоды перамогі Расійскай дзяржавы над Напалеонам у вайне 1812 г. Гэтай падзеі прысвечана шмат канферэнцый, “круглых сталоў”, экспазіцый ў музеях. Адна з найцікавейшых тэм вайны 1812 г. – тэма страчанага скарба Напалеона, якая і стала прадметам даследвання ў дадзеным артыкуле.

24 ліпеня 1812 г. «Вялікая армія» Напалеона пераправілася праз Нёман у ваколіцах Коўна (цяпер літоўскі Каўнас) на тэрыторыю Расійскай імперыі. Большая частка падзей вайны 1812 г. адбылася на беларускай зямлі, на абшарах паміж Дняпром і Заходнім Бугам, Паўночнай Дзвіной і Прыпяццю. Упартыя баі пад Мірам, Кобрынам, Астроўна, Полацкам, Гарадзечна, Чашнікамі, Бабруйскам, Смаленскам не перашкодзілі французам 14 верасня 1812 г. уступіць у Маскву, якая была пакінута без бою. Цікава адзначыць, што падзенне Масквы стала першым крокам да падзення самой напалеонаўскай Францыі. Нездарма ўсяго праз некалькі гадоў пасля свайго драматычнага паражэння, падчас ссылкі на востраў Святой Алены, былы імператар напіша ў сваім дзённіку: «Я павінен быў бы памерці адразу ж пасля ўступлення ў Маскву...».

Усяго 34 дні прабылі французы ў Маскве, рабавалі яе, таму што Масква лічылася «ваенным трафеем». За месяц Масква была дашчэнту спалена. З «Вялікай арміі» французскае войска хутка пачало ператварацца ў дрэнна кіруемую банду марадзёраў, рабаўнікоў і гвалтаўнікоў. Безумоўна, Напалеон бачыў разлажэнне сваёй некалі дысцыплінаванай арміі і хутка зразумеў, што страчвае кантроль над ёй. Таму 19 кастрычніка армія пакінула спаленую Маскву. Наперадзе ляжаў шлях дадому. Як і любая армія ў паходзе, войска Напалеона было абцяжарана шматлікімі абозамі, карэтамі,

драбінамі з нарабаваным дабром. Напалеон быў незадаволены, што армія вязе з сабой такую вялікую колькасць дарагіх, але непатрэбных для пахода каштоўнасцей. Пагэтаму французскія салдаты імкнуліся прыкрыць дываны, тканіны, залатыя і срэбраныя рэчы кошыкамі, мукой, іншымі рэчамі. Напалеон, безумоўна, бачыў гэтую маскіроўку, але ён спачатку не рашаўся загадаць пакінуць нарабаванае тут жа, у Маскве, і пазбавіць паўгалодных салдат суцяшальнага ўсведамлення, што яны з цягам часу хаця б чымсьці ўзнагародзяць сябе за ўсе свае пакуты. Яны тады яшчэ не ведалі, что большасці з іх прыдзецца пакінуць у Расіі не толькі маскоўскую здабычу, але і сваё жыццё [1, с. 653].

Што ж уяўляў сабой нарабаваны скарб Напалеона? На сённяшні дзень няма адзінадушша сярод даследчыкаў на гэты конт. Памеры нарабаваных каштоўнасцей называюццы розныя. Лічыцца, што «маскоўскія трафеі» Напалеона склалі 18 пудоў золата (амаль 300 кілаграмаў) і 325 пудоў серабра (5200 кг). Да гэтага неабходна дадаць багатае царкоўнае начынне, старажытную зброю, каштоўнае каменне, посуд. Наўрад ці гэтыя лічбы далёкія ад сапраўднасці, бо добра вядома, што толькі з Архангельскага сабора было ўкрадзена больш за 120 пудоў серабра і каля 3 пудоў золата. Асабістыя абозы са здабычай мелі напалеонаўскія маршалы Багарнэ, Даву, Нэй, Марцье, Мюрат. Акрамя гэтага, французскія салдаты і афіцэры, якія пакідалі Маскву, таксама былі абцяжараны сваімі асабістымі трафеямі. Нават калі ўявіць, што кожны салдат стотысячнай арміі нёс ў сваім заплечніку хаця б паўкіло каштоўнасцяў (манеты, зліткі, ювелірныя вырабы і г.д.), то агульная вага нарабаванага, без уліку абознай паклажы, склала б каля пяцідзесяці тон. Вядома, што "пехацінцы знясільвалі пад цяжарам заплечнікаў" [2, с. 121]. Ад паўкіло, зразумела, ніхто знясільвацца не будзе. Значыць, нарабаванай здабычы было ў шмат разоў больш.

Абоз з нарабаванымі каштоўнасцямі налічваў 25 драбін, а самыя ўнікальныя з іх мясціліся на двух фурманках, якія знаходзіліся пад узмоцненай аховай. Даследчыкі гэта назавуць «крамлёўскімі скарбамі Напалеона I» або «золатам Напалеона». Першы абоз адправіўся з Масквы з моцнай кавалерыйскай аховай у сярэдзіне кастрычніка, яшчэ да таго, як Напалеон пакінуў Маскву і пачаў адступаць па Смаленскай дарозе. Прадугледжвалася, што ў выпадку

паспяховага прарыву арміі да Калугі гэты абоз далучыцца да галоўных сілаў арміі і далей будзе рухацца пад аховай частак корпуса Панятоўскага праз Вярэю і Бароўск. Другі абоз (французскія крыніцы называюць яго “трафейны”) неадлучна ішоў за імператарам да Малаяраслаўца, дзе адбыўся няўдалы для французаў бой.Праврвацца да Калугі не ўдалося, і армія павярнула да Бароўска і Вярэі. 27 або 28 кастрычніка яна сустрэла ў раёне Вярэі першы “залаты абоз”. З гэтага моманту канвой з “маскоўскай здабычай” ішоў да самай Вільні адзіным транспартам, што паступова таяў па дарозе.

Армія Напалеона выйшла з Масквы 6 (19) кастрычніка. Ужо праз два дні на абочынах дарогі сталі з’яўляцца кінутыя абозныя вазы. Пасля бітвы пад Малаяраслаўцам імператар аддаў загад аб падрыхтоўцы арміі да хуткага маршу. Частка абозаў было загадана кінуць. Але гэта не дапамагло: абцяжараная абозамі напалеонаўская армія марудна рухалася праз Бароўск і Вярэю да Мажайска, насуперак загаду Напалеона аб паскарэнні маршу. Так, 28 кастрычніка штаб імператара ўжо знаходзіўся каля Мажайска, у той час, як ар’ергардныя часткі Даву яшчэ цягнуліся дзесьці ў гразі пад Бароўскім. Па ўспамінах сяржанта Бурганье, падчас руху ад Малаяраслаўца да Мажайска французамі была пакінута значная частка нарабаванай здабычы: “Дарогі канчаткова сапсаваліся, калёсы, нагружаныя здабычай, цягнулісяз цяжкасцю, многія з іх апынуліся зламанымі... Уся дарога была ўсеяна каштоўнымі прадметамі: карцінамі, кандэлябрамі, мноствам кніг...” [16, с. 22]. Дывізіі Жэрара, якая ішла ў ар’ергардзе арміі, было загадана знішчаць пакінутае дабро,скідваючы яго ў рэкі, азёры, балоты, запоўненыя вадой канавы. Часцей за ўсё заторы здараліся на мастах праз шматлікія рэкі і рачулкі, і тады ў ваду ляцелі цэлыя вазы са здабычай. Толькі на шляху ад Малаяраслаўца да Вярэі французам не менш за пяць разоў прыходзіласяз вяртацца д агэтай “працэдуры”.

На шляху ад Дарагабужа да Смаленска французская армія атрымала загад Напалеона: спаліць усе трафеі. І зноў у агонь паляцела толькі найменш каштоўнае і кампактнае: прадметы старыны, адзенне, антыкварыят... Але з золатам і срэбрам ніхто развітвацца не спяшаўся - пакуль 5 лістапада ў баі пад Чырвоным

лейб-гвардыі уланскі полк захапіў абоз 1-га корпуса маршала Даву з маскоўскімі трафеямі, сярод якіх была “залатая казна” – золата і срэбра на суму 31тыс. рублёў асігнацыямі.

Гэтая здабыча стала здабыткам палка і паступіла ў палкавую арцель. У далейшым з гэтых сродкаў быў складзены так званы “Красненскі капітал”, і кожны салдат – удзельнік справы 5 лістапада, выбываючы з палка, ўзнагароджваўся пяцідзесяццю рублямі з “Красненскага капіталу”. З гэтага моманту чуткі аб скарбе Напалеона пачынаюць лавінападобна нарастаць.

Доўгі час прэваліравала думка, што «напалеонаўскія трафеі» да Беларусі не даехалі і схаваны ў Семлеўскам возеры ў ваколіцах Вязьмы, недалёка ад старой Смаленскай дарогі [3]. На тое, што менавіта ў Семлеўскім возеры быў затоплены скарб Напалеона, указваў ад’ютант Напалеона — граф дэ Сегюр, які сцвярджаў, што французскі імператар «загадаў, каб маскоўская здабыча, старажытныя даспехі, гарматы і вялікі крыж з храма Івана Вялікага былі кінуты ў Семлеўскае возера як трафеі, якія яму не хацелася аддаваць назад і якія ён не меў магчымасці везці з сабой» [4, с. 43]. Возера не раз абшуквалі. У 1911 г. гісторык-археолаг Н.А. Скварцоў паведамляў, што тут летам праводзіліся чарговыя пошукі, у выніку якіх было знойдзена толькі некалькі тлелых ласкутоў зялёнай тканіны, дзве з паловай падковы [5, с. 216]. Усплеск «залатой ліхаманкі» вакол вадаёма зафіксаваны ў 1960-я гады, калі спецыялісты з Усесаюзнага НДІ гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі ўстанавілі, што вада Семлеўскага возера мае павышанае ўтрыманне медзі, цынку і, што галоўнае, серабра. Вядома, што паламаны крыж са званніцы Івана Вялікага застаўся ляжаць ў Крамлі каля Успенскага сабора, і дэ Сегюр, відаць, сваімі ўспамінамі проста меў на мэце дэзінфармаваць шукальнікаў “золата Напалеона”. Пагэтаму Семлеўскае возера наўрад ці можна назваць могільнікам знакамітага абоза з “залатымі крыжамі”. Даследчык вайны1812 г., дырэктар Інстытута ваеннай гісторыі Міністэрства абароны СССР П.А. Жылін лічыў, што тапіць скарб у Семлеўскім возеры імператару не мела сэнсу, бо пасля Вязьмы яшчэ не наступіў крызіс у напалеонаўскай арміі і Напалеон разлічваў яшчэ ўзяць рэванш і пасля зімоўкі працягнуць вайну з Расіяй. Больш таго, французам не было патрэбы адхіляцца па дарозе Малаяраславец-

Вязьма да ляснога Семлеўскага возера, якое знаходзілася ў аддаленнасці [6, с. 398].

Навошта ж Напалеону і яго паплечнікам спатрэбілася распускаць чуткі аб вывазе крыжа з Масквы? Г.Ю. Мазінг і Л.Ф. Ерусалімчык лічуць, што, хутчэй за ўсё, для прэстыжу, бо Напалеон спадзяваўся, што пасля ўзрыву Крамля (ён быў ажыццяўлены пасля сыходу французаў з Масквы) там будзе цяжка што-небудзь выявіць [7, с. 82].

Як вядома, далей шлях адступлення напалеонаўскай арміі пралягаў праз Беларусь – гарады і мястэчкі Оршу, Коханава, Талачын, Бобр, Барысаў, Зембін, Плешчаніцы, Маладзечна, Смаргонь (далей — на Вільню, Коўна, Варшаву). Руская армія праследавала войскі Напалеона літаральна “па пятах”. Хутка прасоўвацца арміі Напалеона перашкаджалі абозы з нарабаваным, пагэтаму ўзнікала неабходнасць з ім развітацца. Па сведчанні напалеонаўскага маршала Берцье, толькі некалькі фурманак з казной дабраліся да Коўна. Астатняе бясследна знікла па дарозе. Большасць з даследчыкаў, якія займаліся і займаюцца таямніцай «напалеонаўскага скарбу», лічыць, што ён застаўся на беларускай зямлі. Самай жа папулярнай версіяй з’яўляецца затапленне скарбу на дне аднаго з азёраў або пад хвалямі той ці іншай ракі ў Беларусі. І азёраў, і рэк уздоўж гэтага маршрута безліч. Утапіць нарабаванае Напалеон мог ў любым (ці любой) з іх. Народных паданняў пра тое, што «напалеонаўскае золата» ляжыць на дне канкрэтнага возера ці вось у гэтай рацэ, існуе нямала (гавораць пра азёры Стаячае, Лясное, Арэхаўскае, Святое). Нагадаем самыя папулярныя з іх.

У горад Орша, які стаіць на Дняпры, французы ўступілі 20 лістапада 1812 г., страціўшы перад гэтым каля 25 000 чалавек у баях каля Краснага. У Оршы Напалеон правёў два дні. Тут яму прынеслі вестку, што да горада набліжаюцца казакі атамана Мацвея Платава. Гэта прымусіла імператара даць загад на адступленне і ўтапіць у Дняпры «маскоўскія трафеі», у тым ліку знакамітае сярэбранае панікадзіла вагой у 112 пудоў, вывезенае французамі з Успенскага сабора Крамля [8, с. 198]. У паніцы французы спалілі і 60 пантонаў, пра адсутнасць якіх потым вельмі шкадавалі падчас пераправы цераз Бярэзіну. Па некаторых сведчаннях, дняпроўскія хвалі схавалі на дне ракі шыкоўныя падсвечнікі, дарагі царкоўны посуд,

сярэбраныя і залатыя аправы абразоў, старадаўніх кніг, упрыгожаных каштоўнымі каменнямі, вырабы з каляровага шкла, гарматы і іншую зброю. Пра Оршу, як месца затаплення каштоўнасцей, пісаў і ад'ютант М.І. Кутузава Аляксандр Міхайлоўскі-Данілеўскі: «Мноства скарбу, які абцяжарваў армію, загадана знішчыць... або ўтапіць у Дняпры так званыя трафеі, вывезеныя з Масквы» [3, с. 96]. У Оршы 21 лістапада 1812 г.па распараджэнню Даву з-за адсутнасці коней і фурманак увесь архіў напалеонаўскай арміі, які да той пары дбайна зберагаўся, быў спалены. Магчыма, у гэтым архіве ўтрымліваліся дакументы з дакладным рэестрам нарабаваных французамі каштоўнасцей.

У якасці месца, дзе захоўваецца нейкая частка французскіх скарбаў, называецца возера Стаячае паблізу мястэчка Крупкі Сенненскага павета Магілёўскай губерні. "Існуюць сведчанні шматлікіх" ваенных асоб, "што ў гэтым возеры на дне захоўваюцца трафеі 1812 г. і ўцёкаў французаў" – пісала ў 1911 г. газета "Новы час" [10, с. 221-222]. У гэтай мясцовасці, пачынаючы з 1870-х гадоў, загаварылі аб тым, што ў возеры французамі падчас уцёкаў былі затопленыя нарабаваныя скарбы маскоўскіх цэркваў. У 1870-х гадах адзін з мясцовых памешчыкаў заняўся вышукам легендарных скарбаў, прычым карыстаўся такім прымітыўным сродкам, як выграбанне вады. Зразумела, што з гэтай задумы нічога не выйшла, нягледзячы на тое, што ён рабіў неаднаразовыя спробы. Возера Стаячае не раз станавілася аб'ектам для шукальнікаў скарбаў. Якраз яны і высветлілі, што ў возеры падвойнае дно: ад паверхні вады ідзе двухметровы слой густых водарасцей, пасля слой мутнай вады аж у дзевяць метраў і, нарэшце, дно з пяску і глею. Апошняя экспедыцыя па абследванню возера адбылася ў 1980 г. Працу прыйшлося праводзіць зімой, бо возера Стаячае адметна плаваючымі берагамі на падушках з торфу, таму падыйсці да вады можна толькі ў моцныя халады, калі непраходная дрыгва вакол возера цалкам прамярзае. У ваду з нулявой тэмпературай вадалазы апускаліся ў ваенных гідракасцюмах з балонамі ад акваланга. Аказалася, што торф на дне згустнелы настолькі, што даводзілася ўжываць адмысловыя шчупальцы і прыборы для пошуку,а карані адмерлых раслін дасягалі даўжыні ў два метры і былі таўшчынёй з чалавечую нагу. Але ні срэбра, ні золата знайсці так і не ўдалося. Затое пробы

вады і грунта, узятыя з возера, былі накіраваныя ў Ташкенцкі НДІ гідралогіі і геахіміі. Вынікі паказалі на анамальна высокае ўтрыманне ў вадзе золата, серабра і плаціны. Нядзіўна, што мясцовыя жыхары лічылі гэтую ваду гаючай, а памешчыкі на гэтай вадзе выраблялі спірт і гарэлку на ўласных заводах. Вядома, што, калі захоўваць ваду ў сярэбраных ёмістасцях ці проста пакласці ў яе сярэбраныя прадметы, то іёны срэбра пераходзяць у раствор. Працэс гэты досыць доўгі. Падобныя працэсы магчымыя і з золатам, і з плацінай, аднак гэта патрабуе яшчэ больш працяглага перыяду ўздзеяння (у дадзеным выпадку – прыроднага) і асаблівых, спецыфічных умоў.

Але найбольш верагодным месцам затаплення нарабаваных французамі скарбаў лічыцца рака Бярэзіна паблізу ад вёскі Студзёнка (ваколіцы Барысава). Менавіта тут армія Напалеона была акружана рускімі войскамі, але французы ў неймаверна цяжкім, амаль бязвыхадным становішчы ўсё ж змаглі ажыццявіць пераправу, страціўшы пры гэтым 70 тыс. чалавек. Яны здолелі навесці цераз раку ўсяго дзве пераправы (60 пантонаў было спалена Напалеонам у Оршы). Напалеону зноў прыйшлося аддаваць загад: паліць афіцэрскія і генеральскія экіпажы, фурманкі з трафеямі. На правы бераг, да вёскі Брылі, пераправілі толькі асабісты абоз Банапарта, у якім было 715 запражаных і верхавых коней. Па чутках, многае з нарабаванага французы ў паніцы закапалі ў лясах вакол Студзёнкі, утапілі ў Бярэзіне. Але ж ці існаваў час у французскіх салдат, шчыльна праследуемых рускай арміяй, знаходзячыхся ў стане бязладдзя і анархіі, усур’ёз займацца хаваннем скарбаў? Тым не менш, гістарычна вядома, што адразу пасля заканчэння вайны ў міністэрствы замежных спраў некаторых еўрапейскіх дзяржаў і пасольствы Расіі за мяжой сталі звяртацца асобы, якія ўдзельнічалі ў расійскай кампаніі Напалеона 1812 г., з просьбай дазволіць ім выехаць на тэрыторыю Расіі. Узнікае пытанне: навошта людзям, у якіх Расія павінна выклікаць жах і нялепшыя пачуцці, зноў сюды ехаць? Напэўна, сапраўды яны марылі знайсці захаваныя скарбы.

Пошукі ў Студзёнцы пачаліся адразу ж пасля заканчэння бітвы на абодвух берагах ракі. Вось што распавядае вядомы археолаг і гісторык граф Я.П. Тышкевіч у апісанні Барысаўскага павета,

выдадзеным у 1847 г. Пасля заканчэння бітвы пад Студзёнкай мясцовыя ўлады распарадзіліся расчысціць поле бітвы і раку. Сагналі сялян амаль з усяго павета. З лёду высякалі ўмёрзлыя экіпажы. З-пад снегу выцягвалі кінутую маёмасць. У навакольных лясах знаходзілі мноства замёрзлых французаў. Дзесяткі тысяч варожых трупаў былі закапаны ў велізарных ямах у ваколіцах Студзёнкі. Пры гэтым было сабрана нямала нарабаванага дабра, якое французы цягнулі з Масквы: мармуровыя статуі, карціны, сервізы з найлепшага гатунку фарфору і крышталю, сталовае срэбра, дарагія адзенне і бялізну, залатыя прадметы. Пасылаючы сваіх прыгонных на працу ў Студзёнку, гаспадары патрабавалі ўсё знойдзенае аддаваць ім. Акрамя таго, мясцовыя памешчыкі карысталіся недасведчанасцю сялян і скуплялі ў іх каштоўнасці (залатыя гадзіннікі, ланцужкі, кольцы, сярэбраны посуд) за бясцэнак. З мясцовых памешчыкаў больш за ўсіх стараўся барон Корсак, у сядзібе якога Напалеон начаваў на шляху да Студзёнкі. Корсак арганізаваў цэлую выставу экіпажаў, сёдлаў і збруі, дастаўленых яму слугамі. У сваім кабінеце ён размясціў калекцыю каштоўных узораў зброі, а скрыні камода заваліў ордэнамі, медалямі і значкамі [7, с. 83].

Беларускія даследчыкі гісторыі вайны 1812 года Г.Ю. Мазінг і Л.Ф. Ерусалімчык лічуць, што галоўныя скарбы ў Студзёнцы былі знойдзены ў 1813 г., калі па распараджэнню ўрада пад Студзёнкай рабілася расчыстка рэчышча Бярэзіны [9, с. 84]. Аб знаходках у гэты час распавядае ў сваіх успамінах Генрых Роос. Ён пражыў у Барысаве каля года. Улетку 1813 г. ён здзейсніў падарожжа ў Студзёнку і потым напісаў: «На месцы пераправы сустрэў маёра сухапутных і водных войскаў яшчэ з адным афіцэрам і некалькімі салдатамі. Яму была даручана ачыстка ракі. Ён здабыў з ракі гарматы і ўсялякага роду экіпажы і ведаў пра месца, дзе іх яшчэ больш ляжыць у балоце і на дне ракі...У чамаданах, скрынях і т.п. ён знайшоў срэбра ў злітках і плітках значнай велічыні і вагі, золата, каштоўныя камяні і шмат прыгожых і карысных рэчаў. Шмат чаго з гэтага ён паказаў нам...Мне маёр падарыў шпагу, шаблю і ангельскае сядло» [11, с. 89].

Адзначаны выпадкі і дзяржаўнай увагі да пошукаў скарбаў. Цікавы дакумент захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі

Беларусь. Справа называецца «Аб пошуку грошай, закапаных французамі». З дакумента вынікае, што 18 ліпеня 1851 г.нейкі «дваранін Адам Шчалкоўскі данёс віленскаму ваеннаму губернатару, што яму вядомы некаторыя месцы ў Заходніх губернях, дзе французскія войскі, якія рэціраваліся ў 1812 г., закапалі ў зямлю скрыні з грашыма»... Паказанні Шчалкоўскага сталі вядомы шэфу корпуса жандараў, які, у сваю чаргу, далажыў аб гэтым імператару Мікалаю І. Мікалай І дазволіў Шчалкоўскаму пошукі скарба і нават выдзеліў яму ў дапамогу спецыяльнага чыноўніка з Вільні. Пошукі пачаліся 30 ліпеня 1851 г., а 2 жніўня былі спынены па прычыне адсутнасці якіх-небудзь каштоўнасцей [8, с. 205].

У 1895 г. на імя міністра земляробства паступіў ліст з Барысава. Нехта Рачкоўскі раскрываў сямейную таямніцу: калісьці адзін з удзельнікаў вайны 1812 г., салдат 14 егерскага палка перад смерцю казаў, што ў горадзе каля ракі Берэзіны закапаў багаты трафей – восем бочак золата. Міністэрства перадала ліст у Археалагічную камісію, аднак ліст застаўся па за ўвагай. Тады Рачкоўскі звярнуўся ў Міністэрства ўнутраных спраў, і яно дазволіла правесці раскопкі. Але ж па прычыне адсутнасці сродкаў праца была спынена [10, с. 229-230]. У 1910 г. пошукі ў Студзёнцы праводзіў барысаўскі землеўладальнік І.Х. Каладзееў. Ён знайшоў у рацэ асобныя прадметы ўзбраення і манеты. Падобныя рэчы захоўваюцца ў Барысаўскім краязнаўчым музеі.

Лёс выкрадзеных маскоўскіх трафеяў быў канчаткова вырашаны толькі за Вільняй. Па сведчанням шматлікіх відавочцаў, рэшткі “залатога абозу” былі дашчэнту разрабаваныя зусім страціўшымі чалавечае аблічча садатамі і афіцэрамі “Вялікай арміі” 10 снежня 1812 г. на дарозе паміж Вільняй і Коўна, калі падводы бездапаможна спыніліся перад пакрытым лёдам уздымам на Панарскую гару. З-за галалёдзіцы на яе не мог заехаць ні адзін воз, і ні адзін экіпаж, не кажучы ўжо пра цяжка нагружаныя фургоны. Менавіта тут, ля падножжа гэтай гары, загінулі і “залаты абоз”, і ўся дзяржаўная казна [5, с. 216]. Відавочца Грыуа піша, што тут «усе трафеі, якія вёз імператар з Масквы, яго карэты, фургоныз золатам – усё было страчана або разрабавана казакамі і нават нашымі ўласнымі салдатамі, хоць, я думаю, вельмі нешматлікія з іх

прывезлі сваю здабычу ў Францыю » [2, с. 327]. Іншы сведка, Штейнмюллер, так апісвае гэты эпізод: “... Мы на досвітку 10 снежня пакінулі горад (Вільня) і пайшлі па дарозе да Коўна. Гадзіны праз дзве мы прыйшлі да абледзянелай падэшвы пагорка, настолькі стромкага, што на яго немагчыма было ўзлезці. Вакол былі раскіданы рэшткі экіпажаў Напалеона, пакінуты ў Вільні пры адступленні абоз, паходная каса арміі і яшчэ шмат калёс з цяжкімі маскоўскімі трафеямі; яны не маглі падняцца ў гару ... Усе кінуліся да павозак: ўзламалі касы, у якіх было яшчэ каля пяці мільёнаў франкаў, грошы вынялі і падзялілі ... » [2, с. 331]. Тое ж самае пра абставіны гібелі абозу з нарабаванымі каштоўнасцямі кажуць Лабом, Кастэлана, граф Хохберг, Комб, Леманье , дэ Кастэлан і інш. [4, с. 310-312, 319, 323]. Па словах самога Напалеона, “у Вільні мае войскі разрабавалі дванаццаць мільёнаў” [10, с. 239]. Разгром “залатога абозу” давяршылі казакі Платава, якія адбілі частку “маскоўскай здабычы”. Частка трафеяў, захопленых у Панарскай гары, была накіравана ў Новачаркаск.

Тым не менш, ацалелыя салдаты і афіцэры імператарскай гвардыі, усяго 400-500 чалавек, на чале з маршалам Бертье выратавалі рэчы, якія асабіста належылі імператару – золата і сталовае срэбра. Але ж рабаванне фур з золатам працягвалася і пасля пераходу французамі Нёмана.

Такім чынам, частка казны “Вялікай арміі”, пераважна ў залатой і сярэбранай манеце, была вывезена з Расіі, іншая частка казны і “маскоўскай здабычы” была разрабавана салдатамі арміі Напалеона або адбіта рускімі авангарднымі часцямі. А вось лёс трэцяй часткіі лёг у аснову легенд аб “маскоўскай здабычы” і “золаце французаў”. Няма ніякіх сумненняў у тым, што частка скарбаў засталася ляжаць на шляху адступлення “Вялікай арміі”, у тым ліку, і на беларускай зямлі.

Літаратура:

1.Тарле Е.В. Нашествие Наполеона на Россию, 1812 год / Е. В. Тарле; [послесловие В. Н. Балязина]. – Москва : Воениздат, 1992. – 303с.

2. Васютинский А.М. Французы в России / 1812 г. по воспоминаниямсовременниковиностранцев: Сборник, сост.

А.М. Васютинским, А.К. Дживелеговым и С.П. Мельгуновым / Историч. комис. Учеб. отд. ОРТЗ. – М.: Задруга, 1912. – 352 с.
3.Михайловский-Данилевский, А.И. Описание Отечественной войны 1812 года / А.И. Михайловский-Данилевский – СПб.: Изд. А.А. Каспари 1899.– 720 с.
4.Де-Сегюр, Ф.П. Поход в Россию. Записки адъютанта императора Наполеона / Ф.П. Де-Сегюр. – М., 1911. – 156 с.
5.Белянчиков, Н.Н. Судьба сокровищ, похищенных Наполеоном в Москве / Н.Н. Белянчиков // Вопросы истории. – 1965. – № 4. – С. 215-217.
6.Жилин П.А. Отечественная война 1812 года / АН СССР, Отд-ние истории. – М.: Наука, 1988. – 494 с.
7. Мазинг, Г.Ю. Березина, год 1812 / Г.Ю. Мазинг, Л.Ф. Ерусалимчик. – Минск: Полымя, 1991. – 127 с.
8. Асіноўскі, С.М. Што раньш было…/ С.М. Асіноўскі. – Мінск: Беларусь, 2008. – 207 с.
9. Шашок, І. Загадка Стаячага возера / І. Шашок // Чырвоная змена. – 20 красавіка 1968 г.
10. Непомнящий, Н.Н. Тайны кладов / Н.Н. Непомнящий. – М.: Вече, 1999. – 409 с.
11. Роос, Г.У. С Наполеоном в Россию: Записки врача великой армии / Пер. с нем. под ред. И. Н. Бороздина. – М.: Сфинкс. Тип. Т/Д Худож. печать, 1912. – 334 с.

## Конструирование национально-исторических мифов (на примере исторических трудов М. Довнар-Запольского)

**С.А. Рогач, преподаватель**

В силу исторических обстоятельств в последние несколько десятилетий в научной среде и в общественных кругах разных стран мира вновь обрели актуальность проблемы национального самоопределения. Отчасти это объясняется глобальными политическими и социальными трансформациями, а отсюда – сломом стереотипов, переоценкой ценностей, пересмотром многих, казавшихся до сих пор незыблемыми, концепций. Однако, несмотря на широкую разработку теорий по «национальной истории» в западных научных